*Л. Л. Ражкова*

# ПРАБЛЕМЫ ВЫХАВАННЯ НАРОДНАГА СПЕВАКА ВА ЎМОВАХ КУЛЬТУРНАЙ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Культурныя зносіны паміж народамі з'яўляюцца неад'емнай часткай развіцця чалавецтва. Ні адна дзяржава не мае магчымасці задаволіць культурна-эстэтычныя запатрабаванні сваіх грамадзян без звароту да сусветнай культурнай спадчыны. Працэс зносін носіць двухбаковы характар. Для кожнай нацыянальнай культуры вельмі важна захаваць і пашырыць у свеце найперш здабыткі сваёй культуры, у той жа час мае значэнне магчымасць выкарыстоўваць здабыткі іншых культур, улічваючы свае, нацыянальныя інтарэсы. Асаблівую актуальнасць праблемы захавання і развіцця нацыянальнай культуры, акультурацыі, асіміляцыі і культурнай інтэграцыі набылі менавіта ў перыяд глабалізацыі, калі змены ва ўсіх сферах жыцця чалавека прыкметна паскорыліся. Пошукі свайго месца ў сусветнай культурнай прасторы актуальныя і для Рэспублікі Беларусь. Адкрытая для дыялога, Беларусь становіцца ўсё больш залежнай ад культурна-інфармацыйных працэсаў, што працякаюць у свеце, і найперш такіх, як глабалізацыя культурнага развіцця і культурнай індустрыі з англа-амерыканскім уплывам, камерцыялізацыя культурнай сферы, развіццё інфармацыйных тэхналогій і сусветных камп'ютарных сетак – калі ўвесь свет на адлегласці выцягнутай рукі, паскоранае пашырэнне аб'ёму інфармацыі і хуткасць яе перадачы; паніжэнне нацыянальнай спецыфікі ў сусветным інфармацыйна-культурным абмене.

Важныя гэтыя пытанні і датычна народнапесеннай творчасці. Адпаведна выхаванне народнага спевака на этнакультурных каштоўнасцях ставіць сваёй мэтай спрыяць захаванню нацыянальна-культурнай адметнасці, пашырэнню народнай песні ў сучасным жыцці чалавека.

Навучанне народнай манеры спеваў – гэта жывы творчы працэс, які пастаянна развіваецца і абапіраецца на традыцыйныя вакальна-педагагічныя метады. Аднак сёння ў адукацыі спевакоў з народнай манерай спеваў прасочваецца тэндэнцыя ўніфікацыі, якая прадстаўлена агульнанацыянальнай стылізаванай манерай спеваў. Вялікая частка вакальнага матэрыялу, які гучыць са сцэны і ў класе – гэта народная песня ў стылізаваным выглядзе.

У дадзеным артыкуле мы не будзем разглядаць вакальна-стылявыя і моўныя асаблівасці, тонкасці навучання народнаму

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вакальна-тэхнічнаму майстэрству і майстэрству перадачы мастацкага вобраза. Спынімся на такім важным баку развіцця асобы народнага спевака, як фарміраванне яго міфалагічнай свядомасці, бо міфам пранізаны ўсе пласты этнічнай культуры, і фальклор асабліва.

З пункту гледжання навукі ў сучасным свеце міф – гэта выдумка, казка. А з пункту гледжання самога носьбіта міфалагічнай свядомасці міф – гэта не фікцыя, не фантазія, а рэальныя падзеі і ўчынкі. Для спевака – носьбіта традыцыі міф заўсёды рэальнасць, канкрэтнасць. Ён ставіцца да слова, гуку і зместу песні як да цаглінак прасторы быцця, пры дапамозе якіх ён структуруе сваю асобасную прастору, стварае, афармляе і паляпшае сваю жыццёвую рэальнасць і рэальнасць блізкіх яму людзей.

Для сучаснага спевака-прафесіянала міф – гэта выдумка і фантазія, словы песні для яго прыгожая метафара, песня ўяўляецца мастацкім творам. Па словах славутай даследчыцы фальклору Е. Э. Лінёвай, «народ замілоўваецца перад сваёй песняй», а прафесіяналы «сыходзяць да яе». Таму так адрозніваецца аўтэнтычнае выкананне фальклору ад штучнага, завучанага. Народ шчыра жыве ў тым свеце, які апявае, а прафесіяналы толькі тлумачаць яго.

Мяркуецца, што менавіта розніца ў асэнсаванні і адчуванні быцця, якая назіраецца ў традыцыйных спевакоў і сучасных канцэртных выканаўцаў народнай песні, можа адказаць на пытанне, чаму ж фальклор не існуе ў адукацыйным працэсе ў поўную сілу.

Шматгадовыя назіранні за працэсам навучання студэнтаў – будучых выканаўцаў народнай песні паказалі, што большасць з іх не здольны адчуць і перадаць слухачам увесь багаты падтэкст народнай песні. Выкананне не выклікае глыбокіх перажыванняў і водгукаў. Першапачаткова рашэнне праблемы мы бачылі ў дадатковым развіцці ўяўлення і ўспрымання нашых студэнтаў, іншых тонкіх інструментаў псіхікі. Аднак вынікі іспытаў па пастаноўцы голасу і сольных спевах не паказалі відавочных змен у выканальніцтве. Як высветлілася з гутарак з выканаўцамі, праблема ў тым, што студэнты не могуць уявіць сабе тагачасныя ўмовы, усвядоміць сваё зліццё з тым навакольным светам, успрымаць свой гук, словы песні як будаўнічы матэрыял самога быцця. Яны бачаць перад сабой клас, а не поле, выкладчыка, а не героя, сцэнічную пляцоўку і гэтак далей – звыклае, тое, што прывязвае іх да сучаснасці, што існуе цяпер. Яны імкнуцца максімальна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваць розныя выразныя сродкі, але ім «не верыш». Няма «праўды» ў тым, што яны спяваюць. Не жывуць яны ў песні, а песня не жыве ў іх.

Яскравым прыкладам «уваходу ў міф» могуць служыць этнаграфічныя канцэрты. Носьбіты традыцыі, трапіўшы на такі канцэрт, напачатку губляліся і аддзялялі сябе ад сваёй песні, не зліваліся з ёю душой. Гэта не дзіўна. Яны знаходзіліся ў нязвыклых умовах, і іх увагу пастаянна адцягвалі сафіты, публіка, апладысменты, чаканні і цікавасць шматлікіх людзей. У такіх умовах, складалася ўражанне, яны проста спяваюць як умеюць. І нават такое «мёртвае» выкананне для нас цікава само па сабе, асабліва з прафесійнага пункту гледжання: якім гукам яны спяваюць (адкрытым, прыкрытым, блізкім, глыбокім), як галасы вядуць, як паводзяць сябе падчас выканання?

Але былі і моманты, калі для спевакоў не існавала ні аўдыторыі, ні розных акалічнасцей, яны спявалі дзеля песні. Была толькі песня. Песня жыла і ўсе жылі ў ёй, у кожным яе гуку. «Справілі як мае быць», – менавіта так скажа артыст – носьбіт традыцыі, а не «ўдала выканалі», як скажа прафесійны спявак. У падобных выпадках у народзе гавораць «спявае душа» – аб спрадвечным і вечным, як і яна сама. Мяркуем, што гэты стан душы і пазначаецца тэрмінам «ўваходжанне ў фальклорную сітуацыю», што і ёсць найпершая задача ў выхаванні народнага спевака. Думаецца, што менавіта гэтая выканальнікая адметнасць тлумачыць, чаму традыцыйная народная песня ўтрымлівае даволі вялікую колькасць строф, якія ў сучасным прафесійным выкананні значна скарачаюцца.

Такім чынам, у навучальным працэсе асаблівыя цяжкасці чакаюць выкладчыкаў народных спеваў у фарміраванні міфалагічнай свядомасці спевака, бо як увесці асобу ў гэты пата-емны свет, якія знайсці метады ўздзеяння, як ўсё растлумачыць? На гэтыя пытанні наўрад ці ёсць адназначныя адказы. Можна развіць і паставіць голас спевака, даць яму дастатковую суму ведаў вакальных і фальклорных, выпрацаваць і замацаваць пэўныя навыкі, узброіць яго арсеналам выразных сродкаў, але без пранікнення ў духоўны свет народа, разумення псіхалогіі спевака з народа, спецыфікі міфалагічнай свядомасці песня застанецца «мёртвым злепкам».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Алексеев, Э. Е.* Фольклор в контексте современной культуры: рассуждения о судьбах народной песни / Э. Е. Алексеев. – М.: Сов. композитор, 1988. – 236 с.

*2. Холупава, Л. І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам. / Л. І. Холупава, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

*3. Шамина, Л. В.* Воспитание самобытной личности народного певца / Л. В. Шамина //Народно-певческое образование в России: проблемы и пути развития: материалы Всероссийских научно-практических конференций 1992, 1995 гг. и педагогического семинара 1997 г. / РАМ им. Гнесиных. – М., 1998. – С. 4–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ